УДК 340

# ПРАВАВОЕ ВЫХАВАННЕ СРОДКАМІ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

***Мілеўская Святлана Генадзьеўна***
Сярэдняя школа № 1 г. Круглае
(г. Круглае, Беларусь)

*У артыкуле адзначаецца мэта выхавання ў сістэме адукацыі. Вызначаецца прававое выхаванне як адзін з накірункаў выхавання навучэнцаў. Прапануецца на прыкладзе твораў, прызначаных праграмай для вывучэння ў VI класах, разгледзець, як урок літаратуры можа садзейнічаць фарміраванню прававых кампетэнцый вучняў. Падкрэсліваецца роля роднага слова ў фарміраванні светапогляду маладога пакалення.*

Адной з функцый адукацыйных устаноў Рэспублікі Беларусь з’яўляецца выхаванне згодна з артыкулам 17 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі [2]. Мэта выхавання – фарміраванне рознабакова развітай, маральна сталай, творчай асобы навучэнца ў адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі і Канцэпцыяй бесперапыннага выхавання дзяцей і навучэнскай моладзі [3]. Адным з асноўных напрамкаў выхавання навучэнцаў з’яўляюцца прававое выхаванне, накіраванае на фарміраванне прававой культуры, законапаслухмяных паводзін, разуменне навучэнцам адказнасці за супрацьпраўныя дзеянні [3, с. 3].

Навучальны працэс у сучаснай школе павінен ствараць умовы для прававой асветы вучняў. Аднак часта атрымліваецца, што асноўны кло-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

пат аб прававым выхаванні бярэ на сябе настаўнік грамадазнаўства і класны кіраўнік на выхаваўчых і інфармацыйных гадзінах, пазакласных мерапрыемствах. Мяркуем, што трэба па-іншаму паглядзець на сваю дзейнасць не толькі ў якасці класнага кіраўніка, але і настаўніка-прадметніка. Як мы, настаўнікі беларускай мовы і літаратуры, можам садзейнічаць прававому выхаванню падлеткаў сродкамі прадмета? Як вядома, працэсы навучання і выхавання ў школе ўзаемазвязаны.

Усе ведаюць, якім вялікім выхаваўчым патэнцыялам валодаюць урокі беларускай літаратуры. Прапануем на прыкладзе твораў, прызначанай праграмай для вывучэння ў VI класе, разгледзець, як урок літаратуры можа садзейнічаць фарміраванню прававых кампетэнцый вучняў.

Першы раздзел падручніка «Родная зямля. Мой род. Народ» (вершы П. Броўкі «Прысяга сэрцам», А. Казекі «Я – маленькая кропля з крыніцаў святых», А. Пісьмянкова «Продкі» [1, с. 10] выхоўвае грамадзянска-патрыятычныя пачуцці, дапамагае ўсвядоміць неабходнасць шанавання свайго роду, сваякоў, захавання іх памяці і традыцый, беражлівых адносін да сваёй спадчыны. Тэкст твора У. Ліпскага «Ад роду – да народу» (з кнігі «Я») [1, с. 14] абуджае ў вучняў усведамленне таго, што чалавек – выключная, непаўторная асоба, якая наследуе якасці, рысы, прыкметы сваіх бацькоў і дзядоў, свайго роду, і кожны абавязаны ведаць і шанаваць сваіх продкаў, клапаціцца пра сваіх бацькоў. Легенда У. Караткевіча «Лебядзіны скіт» [1, с. 21] нагадвае праз вобраз галоўнага героя − старога дэрвіша, якім павінен быць сапраўдны патрыёт сваёй краіны, якімі чалавечымі якасцямі павінен валодаць. Гэта і адданасць свайму народу, гатоўнасць ахвяраваць сваім жыццём дзеля выратавання іншых, нянавісць да ворагаў і г. д. Такім чынам, адбываецца засваенне маральных каштоўнасцей.

Разгледзім раздзел «Свет загадак і цудаў». Нашы продкі яшчэ ў далёкай мінуўшчыне адносіліся да нормаў маралі і права як да каштоўнасці і перадавалі нам гэты вопыт у багатай і разнастайнай вуснай народнай творчасці. Аповед беларускіх міфаў і паданняў пра Сварога, Перуна, Дажбога, Ярылу, Жыжаля, Вялеса, вадзянікоў, лесавікоў, дамавікоў, ваўкалакаў, ліхаманак і іншых міфічных істот, з'яўляючыся прадуктамі калектыўнага несвядомага, утрымліваюць у сабе ўяўленні пра дабро і зло, належнае і забароненым, справядлівасць і несправядлівасць, абавязак, гонар, годнасць, сумленне і іншыя маральныя катэгорыі, а таксама першыя вобразы сацыяльных паводзін і практычныя правілы грамадскіх



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

адносін [1, с. 31]. Народная легенда «Дамавікова ўдзячнасць» выкрывае ліхадзейства з мэтай помсты, вучыць дзяцей быць адказным за сваё сумленне [1, с. 41]. Казка Я. Коласа «Жывая вада» алегарычная [1, с. 57]. Жывая Вада ў казцы – гэта алегарычны вобраз Беларусі, гісторыя жыцця грамадства. Праз параўнанне мінулага і сучаснага жыцця нашага грамадства можна паўтарыць правы дзіцяці і чалавека: права на жыццё, на належны ўзровень жыцця, на маёмасць, абарону ад замаху на жыццё і інш.

Радзел «Сэрцам народжаны спеў» прысвечаны беларускім народным і літаратурным песням. Кожны павінен берагчы гісторыка-культурную, духоўную спадчыну і іншыя нацыянальныя каштоўнасці. Азнаямленне з народнымі каляндарна-абрадавымі песнямі «Прыехала Каляда на белым кані...», «Вы, калядачкі, бліны-ладачкі...», «Благаславі, маці, вясну заклікаці...», «А на Купалу рана сонца іграла...» дапамагаюць у фарміраванні любові да нацыянальных традыцый, а на гэтай аснове фарміруецца ў вучняў грамадзянскія якасці [1, с. 65]. Праз вывучэнне сямейна-абрадавых песень «Каля месяца, каля яснага...», «А ў суботу проці нядзелі…», «Рэчанька» [1, с. 68] можна паўтарыць правы і абавязкі бацькоў і дзіцяці.

Не менш цікавым матэрыялам для даследавання з’яўляюцца апавяданне Алены Васілевіч «Сябры» і аповесць «Насцечка» Кузьмы Чорнага з раздзела «Чалавек – гэта цэлы свет» [1, с. 102]. Падчас вывучэння гэтых твораў ствараюцца ўмовы для засваення сістэмы маральна-прававых каштоўнасцей, для выхавання павагі да законаў Рэспублікі Беларусь. Праз творы тлумачацца правы і абавязкі дзяцей і бацькоў.

Творы раздзела «Вайна — боль і памяць народа» (вершы А. Пысіна «Проня», А. Вярцінскага «Два полі», А. Куляшова «Над спаленай вёскай…», апавяданне В. Адамчыка «Салодкія яблыкі») спрыяюць захаванню гістарычнай памяці аб гераічным мінулым беларускага народа, выхаванню патрыятызму. Захаваць гэтыя важнейшыя маральныя каштоўнасці – абавязак кожнага грамадзяніна Рэспублікі Беларусь [1, с. 158].

Апавяданні І. Пташнікава «Алені», Я. Маўра «Багіра», урывак з аповесці «Паляванне на Апошняга Жураўля» А. Жука, «Стары бабёр», верш П. Панчанкі «Сармацкае кадзіла» з раздзела «Зямля мая – зялёны дом» [1, с. 181] спрыяюць выхаванню гуманных адносін чалавека да акаляючага свету. Таксама вучаць ахоўваць прыроднае асяроддзе і беражліва адносіцца да прыродных рэсурсаў, бо гэта абавязак кожнага.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Кожны вучэбны прадмет змяшчае пэўнае поле ідэй, якія ўплываюць на фарміраванне маральна-прававых каштоўнасцей. Аднак знакамітыя асветнікі ўсіх часоў і народаў вышэй за ўсё цанілі філасофскую мудрасць слова, лічылі, што на свеце няма такой педагагічнай велічыні, якую па сіле ўздзеяння на свядомасць чалавека можна было б параўнаць з родным словам: менавіта яму належыць асноўная роля ў фарміраванні нацыянальнага светапогляду маладога пакалення, у станаўленні іх цэласнага духоўнага аблічча.

Мова бацькоў, дзядоў, прадзедаў, іх нацыянальная літаратура і фальклор – спосаб, сродак і сам змест духоўнага развіцця. Нялёгкая, але важная і неабходная мэта – выхоўваць добрасумленных, гуманных, працавітых людзей, дастойных грамадзян нашай краіны.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Бельскі, А. І. Беларуская литаратура : вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. / А. І. Бельскі, М. І. Навумчык, Л. К. Цітова. – Мінск : Нацыянальны інстытут адукацыі, 2022.
2. Кодекс Республики Беларусь об образовании [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://pravo.by/document/?guid=3871&p0=hk1100243. – Дата доступу: 26.11.2023.
3. Концепция непрерывного воспитания детей и учащейся молодежи [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://adu.by. – Дата доступу: 25.11.2023.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова